# КУЛЬТУРОЛОГИЯ

УДК 008.161.3

## ПУБЛІЦЫСТЫЧНАЯ СПАДЧЫНА У. КАРАТКЕВІЧА ЯК СПОСАБ АКТУАЛІЗАЦЫІ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАГА ДЫСКУРСУ

*канд. культуралогіі, дац. П.К. БАНЦЭВІЧ*
*(Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт)*

*Імкненне абудзіць нацыянальны дух і веру народу ў сябе як стваральніка каштоўнасцяў і захавальніка традыцый з'яўляецца той рэфлексіўна-пачуццёвай прасторай, вакол якой фарміруецца інтэнцыянальны масіў культуралагічнага дыскурсу У. Караткевіча. Менавіта таму вызначэнне культуралагічных па сваёй сутнасці інтэнцый у творчай спадчыне пісьменніка (у прыватнасці, у публіцыстыцы) і іх грунтоўны аналіз становіцца адной з актуальных праблем тэорыі і гісторыі культуры. Публіцыстычная спадчына У. Караткевіча разглядаецца праз прызму культуралогіі і трактуецца як з'ява ў культуры. Выяўлены змешчаныя ў публіцыстыцы пісьменніка думкі, праекты, ідэі, якія рэпрэзентуюцца ў рэтра-спектыўнай і перспектыўнай культурна-нацыянальнай прасторы і маюць непасрэдныя адносіны да глыбокага пазнання асаблівасцяў, традыцый і перспектыў беларускай культуры. Актыўная праца У. Караткевіча на ніве публіцыстыкі дэтэрмінуецца жаданнем даць грамадзянскі ўрок сучаснікам, выпрацаваць грамадскую думку, папулярызаваць шырокае кола ведаў пра Радзіму і свой народ, актуалізаваць праблемы суадносін агульначалавечага і нацыянальнага, дэманстрацыйна зацвердзіць беларускія каштоўнасці, актывізаваць беларускія масы, абуджаць нацыянальную свядомасць, выхоўваць этнакультурную самаідэнтыфікацыю.*

**Уводзіны.** Літаратура з'яўляецца арганічнай часткай культуры. Спадчына У. Караткевіча выходзіць за рамкі літаратуры. Пісьменнік інтуітыўна адчуваў духоўныя патрэбы часу і сваёй творчасцю, імкнуўся рэалі-заваць іх. Ён аказваўся на самых значных кірунках беларускага культурнага руху: чуццё мастака і патрыёта сваёй зямлі падказвала яму прыярытэтныя галіны дзейнасці. Як узгадвае А. Мальдзіс, У. Караткевіч у пры-ватнай размове адзначаў: «І адзін чалавек многа можа. Кожны павінен з годнасцю несці свой крыж» [1, с. 158].

Мастак разумеў, што зрабіць трэба вельмі многа, а працаўнікоў мала. Адсюль – шматграннасць дзейнасці. Празаік, паэт, драматург, публіцыст, крытык, кінасцэнарыст, стваральнік і вядучы краязнаўчай тэлеперадачы «Спадчына», мастак, артыст, фатограф. А яшчэ – гісторык, фалькларыст, этнограф, мастацтвазнаўца, ідэолаг нацыянальнага адраджэння, нават місіянер, які абвяшчаў: мой народ – еўрапейскі, гераічны, духоўна багаты і высокакультурны. У. Караткевіч прымаў удзел у грамадскіх арганізацыях, высту-паў у абарону прыроды, ахоўваў помнікі гісторыі і культуры, арганізоўваў іх рэстаўрацыю, уважліва са-чыў за беларускім канфесійным, літаратурна-мастацкім жыццём, унікаў у самыя розныя праблемы, што былі складанымі для Беларусі. У кантэксце савецкай рэчаіснасці гэта была з'ява на культурным полі. Грунтоў-ным падмуркам творчасці пісьменніка была яго вялікая эрудыцыя, энцыклапедычнасць ведаў. Мастак імк-нуўся дасягнуць павышэння ўзроўню адукаванасці беларускага грамадства, уплываць на развіццё інтэлек-туальнай думкі, пашыраць веды пра радзіму і свой народ, далучаць чытачоў да скарбаў айчыннай і сусвет-най культуры. Асаблівае месца займаюць тут сустрэчы з моладзю. Іх актуальнасць дэтэрмінавалася неаб-ходнасцю адпаведнага нацыянальнага выхавання падрастаючага пакалення. У. Караткевіч прагнуў зрабіць многае з неабходнага – напісаць сапраўдныя падручнікі па літаратуры, кнігі па беларускаму мастацтву, бія-графіі знакамітых асоб, навукова-папулярнае выданне па тэорыі літаратуры, энцыклапедычны даведнік пра Беларусь, перажываў з прычыны адсутнасці нацыянальнага кіно, гістарычных п'ес, лібрэта для опер, марыў пра стварэнне серыі з дзесятка раманаў пра беларускае грамадства за сто год пад агульнай назвай «Век». Усё гэта з'яўляецца лепшым сведчаннем апантанасці і шматпланавасці творчай натуры У. Караткевіча, не-абдымнасці яго інтарэсаў, адзінага імкнення як мага больш і пераканальней распавядаць чытачу пра родны край, пра яго знакамітых людзей, пра трагічныя і гераічныя старонкі гісторыі. Патрыятычныя, маральна-этычныя,

эстэтычныя каштоўнасці творчасці У. Караткевіча вызначылі новыя вектары беларускай мас-тацкай літаратуры, публіцыстыкі, беларусазнаўства, акрэслілі кірунак дзейнасці творчай інтэлігенцыі.

Публіцыстыка, мемуары, інтэрв'ю У. Караткевіча характарызуюць не толькі творчую і інтэлектуальную асобу асветніка, яго светапогляд і тып мыслення, але і сацыякультурны працэс часу. Заслугоўвае ўвагі і прыватная карэспандэнцыя У. Караткевіча, якая дае магчымасць больш дакладна вызначыць грамадскія пазіцыі творцы, прасачыць яго ўдзел у культурніцкім руху. Гэтыя матэрыялы складаюць важную крыніцу фактычнай інфармацыі, даюць магчымасць адчуць атмасферу часу, прасачыць складанасць таго ці іншага моманту ў палітычнай і культурнай сітуацыі.

У дадзеным даследаванні здзейснена спроба цэласнай эксплікацыі культуралагічных інтэнцый твор-часці пісьменніка. Мэта даследавання – тэарэтычнае асэнсаванне публіцыстычнай спадчыны У. Караткевіча як спосабу актуалізацыі культуралагічнага дыскурсу.

Пастаўленая мэта патрабуе вырашэння наступных задач:

- вызначыць культуралагічныя рэфлексіі ў публіцыстыцы пісьменніка і прадставіць іх у якасці інтэлектуальна-творчага праекта асэнсавання сутнасных працэсаў, феноменаў, праблем культуры;
- вылучыць, рэпрэзентаваны творчасцю У. Караткевіча комплекс каштоўнасных арыентацый, прадуктыўных у дачыненні да нацыянальнай культуры, да мэтаў і перспектыў яе развіцця на сучасным этапе;
- выявіць сутнасць асветніцкай дзейнасці публіцыста ў дачыненні да вырашэння канкрэтных праблем дзяржаўнага культурнага будаўніцтва, яго арганізацыі і прагназавання.

Культуратворчая спадчына У. Караткевіча з'яўляецца шматгранным і разнастайным аб'ектам наву-ковага даследавання. У сучаснай навуковай літаратуры шматаспектная дзейнасць мастака інтэрпрэтавалася часцей за ўсё зыходзячы з вузкаспецыфічнага, філалагічнага пункту гледжання. Адсутнасць сістэмнага культуралагічнага вывучэння творчай спадчыны пісьменніка не толькі дае магчымасць падрабязнага ас-вятлення культуралагічнай праблематыкі ў творчасці У. Караткевіча, але і пацвярджае актуальнасць, су-часнасць і неабходнасць доследу.

**Метады даследаванняў.** Даследаванне выканана на падставе сістэмнай метадалогіі, што абумовіла комплексны аналіз абмяркоўваемага кола праблем. Аўтарам выкарыстоўваліся метадалагічныя прынцы-пы, зададзеныя класічнай і некласічнай навуковымі парадыгмамі, у прыватнасці прынцып гістарызму, што дэтэрмінавана спецыфікай культуралагічнага кірунку, у межах якога ажыццяўляецца даследаванне. Аўтар, выкарыстоўваючы ў даследаванні прынцып гістарызму, намагаўся паказаць гістарычную абумоў-ленасць і спецыфічнасць спадчыны мастака.

Трэба адзначыць, што публіцыстычная спадчына У. Караткевіча дзеля яе тлумачэння ўводзілася ў аўтарска-біяграфічны і культурна-гістарычны кантэкст жыцця. У рабоце зацвярджаецца сувязь творчасці не толькі з асобай пісьменніка і яго эпохай, але і сувязь паміж мінулым і сучаснасцю. Відавочна, што публіцыстыка У. Караткевіча адлюстроўвае найбольш важныя бакі развіцця грамадства, народу, чалавецтва. Таму грунтоўная культуралагічная ацэнка творчасці мастака магчыма на падставе яе аб'ектыўнага, наву-кова абгрунтаванага прачытання.

У артыкуле прымяняліся герменеўтычны, семіятычны падыходы. Герменеўтычны падыход, які прад-стаўлены ў працах Г.-Г. Гадамера [2], заснаваны на прымяненні працэдур інтэрпрэтацыі для вырашэння задачы разумення тэксту. Паколькі інтэрпрэтацыя з'яўляецца універсальным інструментам аналізу любых гісторыка-культуралагічных і літаратурных тэкстаў, выкарыстанне герменеўтычнага падыходу дапамагае зразумець, як ствараліся творы У. Караткевіча, дазваляе таксама спасцігаць каштоўнасці і сэнсы тэкстаў як інфармацыйных носьбітаў культуры.

Для аднаўлення поўнай карціны меркаванняў У. Караткевіча па самаму шырокаму спектру пытанняў прымяняўся метад гісторыка-культурнай рэканструкцыі. З яго дапамогай рэканструяваліся культурала- гічныя ідэі, прадбачанні, інтуіцыі, практычныя культуратворчыя справы пісьменніка. Метад гісторыка-культурнай рэканструкцыі дазволіў выявіць светапоглядныя парадыгмы У. Караткевіча, абумоўленыя канкрэтным гістарычным кантэкстам.

Вывучэнне культуралагічных інтэнцый у творчасці мастака немагчыма без звароту да генетычнага метаду. Ён дае магчымасць прасачыць асноўныя аспекты творчай спадчыны У. Караткевіча ў іх генезісе і развіцці ў кантэксце агульнакультурнага працэсу і культуралагічных ідэй XX стагоддзя. Як адзначаў М. Бахцін, «Творчая гісторыя – гэта толькі частка генезісу твора. Працы аўтара над тэкстам папярэднічае работа Часу над многімі яе элементамі, над жанрам, пэўным тыпам цэласнасці» [3, с. 331]. Генетычны метад спрыяе даследаванню прычын і мэтаў дзейнасці пісьменніка, высвятляе тэндэнцыі развіцця сацыякультурнага пра-цэсу на Беларусі, рэстаўрыруе лагічную сувязь мінулага з сучасным і будучым у творчасці мастака. З да-памогай генетычнага падыходу разглядаецца працэс стварэння літаратурнага

твору ад задумы да ажыц-цяўлення, да канчатковага тэксту. Аналіз творчай гісторыі мастацкай спадчыны пісьменніка з'яўляецца важным крытэрыем аб'ектыўнасці прачытання, арыенцірам у пошуку яго інтэрпрэтацый.

У даследаванні аўтар выкарыстоўваў гнасеалагічны метад. Ён заснаваны на разглядзе твора як адлю-стравання рэчаіснасці. Пры ажыццяўленні гэтага падыходу ўстанаўліваецца прадмет мастацкага адлюстра-вання (гістарычная эпоха, тэндэнцыі і супярэчнасці грамадскага жыцця), усведамленне створанай пісьменнікам характэрнасці жыцця, глыбіня пранікнення ў яго, аўтарская ацэнка. Пры гэтым падыходзе да твор-часці ў цэнтры ўвагі аўтара даследавання знаходзяцца праблематыка, ідэйная накіраванасць творчасці мас-така, яго светапогляд, праз прызму якога адлюстроўваецца рэчаіснасць.

Аналіз творчай спадчыны У. Караткевіча выклікае неабходнасць звароту і да асобы пісьменніка. Яго светапогляд, чалавечыя якасці, грамадзянская пазіцыя непазбежна выяўляюцца ў творчасці. У сувязі з гэтым узнікае патрэба аналізу біяграфічных фактаў, якія адлюстроўваюць духоўнае, грамадскае жыццё мастака. У гэтых варунках у працы прымяняўся біяграфічны метад, на падставе якога праводзіўся аналіз пэўных фактаў біяграфіі творцы з мэтай лепшага разумення яго ўнутранага свету.

З дапамогай камунікатыўнага падыходу твор разглядаецца як сродак зносін аўтара і чытача, даклад-ней, тэксту і чытача. У дадзенай сувязі твор выступае як арганізаваная інфармацыя, а самыя зносіны набы-ваюць спецыфічныя характарыстыкі.

Абраная метадалогія спрыяе ўсталяванню навуковай рэканструкцыі даследуемых праблем. Гэта да-памагае стварыць цэласнае ўяўленне аб культуралагічных інтэнцыях у творчай спадчыне мастака, як знач-най з'яве ў беларускай культуры ХХ стагоддзя, вылучыць актуальны для сучаснай нацыянальнай куль-туры комплекс праблем, прадстаўленых пісьменнікам, асэнсаваць магчымасць выкарыстання спадчыны У. Караткевіча для айчыннай культуралагічнай думкі пачатку ХХІ стагоддзя.

**Асноўная частка.** У. Караткевіч быў перакананы ў дзейнасці слова, у тым, што пісьменнік – гэта настаўнік, выхавальнік грамадства, які павінен выконваць чарнавую работу: вучыць, пераконваць, раіць. У «Казках янтарнай краіны» публіцыст рэфлексіруе над лёсам мастака: «Калі ён сапраўдны – ён першы сустракае раніцу і першы крочыць, калі вораг з'яўляецца на мяжы ці нават у сэрцы суайчынніка. І ніхто не ведае, што яго сэрца баліць за ўсіх» [4, с. 22]. Пісьменнік не хавае сваіх маралізатарскіх намераў, па-казвае людзям формы жыцця, якія, з яго пункту гледжання, маглі скласціся і зацвердзіцца на глебе ма-ральнага самаўдасканалення. У. Караткевіч тут набліжаецца да поглядаў А. Швейцара, які выступаў за гарманічнае развіццё ўсіх сфер культуры пры панаванні маральнага аспекту. Менавіта таму мысліўца на-зываў сваю канцэпцыю культуры маралістычнай [5].

Паспрабуем выдзеліць некаторыя, на наш погляд, галоўныя кірункі мастацкага аналізу праблем ма-ралі і эстэтыкі, характэрныя для публіцыстычнай спадчыны У. Караткевіча. Гэта абуджэнне і ўзбагачэнне сацыякультурнай памяці беларускага народа, пошук у духоўнай атмасферы мінулага тых маральных каш-тоўнасцяў, што і сёння ўзбагачаюць і мацуюць нацыянальную самасвядомасць беларусаў, фарміруюць яе ў непарыўным адзінстве з сусветнай мастацкай культурай, развіццём патрыятычных якасцей людзей, ухва-леннем супрацоўніцтва паміж народамі як асновы для станаўлення і развіцця высокай культуры між-нацыянальных адносін. Гэта насычанасць твораў сучаснай маральнай праблематыкай праз даследаванне такіх яе значных аспектаў, як мараль і чалавек ва ўмовах НТР, мараль і барацьба за захаванне свету ад ядзер-най катастрофы, чалавек – мараль – экалогія, мараль і развіццё інтэлектуальнага патэнцыялу грамадства. Нарэшце, гэта высокая культура творчага мыслення аўтара, этычнасць, глыбокае веданне мастацкіх твораў розных часоў і народаў, багацце думак, высноў, самабытных ацэнак аб прыгожым у прыродзе, грамадстве, мастацкай культуры, якія зліваюцца ў адзіную цэласную сістэму эстэтычных поглядаў пісьменніка.

Паводле У. Караткевіча, чалавецтва ўзбагачае той, хто дапамагае яму спазнаць сябе, хто паглыбляе яго самасвядомасць. Такі падыход адпавядаў натуры педагога, інтэлігента, які рэалізоўваў свой патэнцыял у асветніцкім ахвярніцтве. Яго нарысы, эсэ, артыкулы – гэта пранікнёныя словы мудрага настаўніка, які цярпліва выкладае чытачам не зусім простыя ісціны, намагаецца максімальна палегчыць успрыняцце матэрыялу. У публіцыстычнай стылістыцы У. Караткевіча сінтэзаваліся праблемная напружанасць, аналі-тычная глыбіня зместу, рамантычна-ўзвышанае выяўленне складаных сацыякультурных працэсаў, тэмпера-ментныя, клічна-прамоўніцкія звароты, вострая дыялагічнасць, гра-мадзянская страснасць, шматлікасць спосабаў уздзеяння на чытача з мэтай пераканаць яго, усхваляваць і схіліць на свой бок: «Падумайце. Падумайце тысячу разоў. На тое вы – людзі, якія жывуць не адно сённяшняй хвілінай, а там хаця і трава не расці. Падумайце аб тым, што знікае ў нябыт, і аб тым, што ёсць і што будзе. Падумайце аб душы народа» [4, с. 198 – 199]. Гэтая цытата красамоўна сведчыць пра

дыдактычна-выхаваўчы разлік, асветніцкі харак-тар яго артыкулаў і нарысаў. Матэрыял падаецца таксама з пазіцыі пазнавальных задач. Мастак абраў тут шлях нацыянальна-маральнага самапазнання, прымушаючы не спыняцца на стадыі пасіўнай эрудыцыі. Эру-дыцыя для У. Караткевіча – гэта актыўная свядомая сіла, якая вызначае спосаб мышлення, стаўленне да прыроды, сацыякультурнай рэчаіснасці, уплывае на выбар ладу жыцця і кірункі дзейнасці чалавека. Творца дзеліцца ўласным вопытам з чытачамі і ўздымаецца да духоўных вышынь – становіцца правадыром: «Я хачу правесці Вас па зямлі, якая для мяне – і, мабыць, не толькі для мяне – даражэй за ўсё, самы ўтульны і ча-роўны кут. І ў Вас, калі Вы наведаецеся сюды, у сэрцах могуць успыхнуць пяшчота і любоў да яе, і таму загадзя раблю Вам падарунак: сапрычашчэнне з яе вялікай памяццю. Добрай і суровай памяццю, якая нічога не забывае, Памяццю Беларусі» [4, с. 170].

У. Караткевіч аднаўляе і мацуе духоўнае поле еднасці з продкамі, славутымі людзьмі роднага краю. Іхнія воблікі паўстаюць у пэўнай эпосе, з унутранай акрэсленасцю поглядаў і памкненняў. Для мастака вельмі важна выявіць нацыянальны дух, маральную годнасць і таленавітасць продкаў. Ён захапляецца па-трыятычным сэнсам жыцця людзей, якія духоўна ўзвысілі быццё на роднай зямлі, і імкнецца, што назы-ваецца, «заразіць гісторыяй» сучаснікаў.

Сярод эсэ пісьменніка найбольшую колькасць складаюць эсэ-прысвячэнні. Яны – пра канкрэтных людзей, якія пакінулі яркі след у айчыннай і сусветнай культурах (Ф. Скарына, М. Багдановіч, Я. Купала, М. Агінскі і інш.). Гэтыя людзі ў артыкулах У. Караткевіча розныя, але ўсе яны блізкія і дарагія нашай зямлі, бо яны – Постаці. Падкрэсліваючы вартасць зробленага тым ці іншым мастаком, творца вылучае ў першую чаргу іх непарыўную сувязь з народам, з грамадзянскім жыццём, «бо няма вялікіх і малых працаўнікоў у чалавецтва, бо кожны, хто шчыра служыць яму і прыносіць яму карысць заслугоўвае нашу павагу і памяць» [4, с. 230]. Гэта неабходная адзнака зробленага. Пісьменнік цесна звязвае ў адзіны ланцуг усе часы. Напрыклад, у эсэ пра Ф. Скарыну перад намі паўстае мінулае, дзе цалкам уладарыць дух, розум выключнага па сваёй энцыклапедычнасці чалавека, «які верыў у сілу дабрыні і ўсё жыццё змагаўся за перамогу гэтай сілы» [4, с. 303]. Перад намі і сучаснасць, у якой не менш праблем, ды гэтак жа неабходныя дабрыня, вера. І ў мінулым, і ў сучасным У. Караткевіча цікавяць праявы чалавечага духу, што ў любой сітуацыі дазваляюць чалавеку заставацца свабодным, выключным: «Праз дух разумнасці – да духу любові. Праз мудрасць і добрыя звычаі – да грамадства, дзе ўсім добра і, галоўнае, справядліва жыць. Тое, на чым і зараз стаяць лепшыя людзі і чалавецтва і з чаго іх аніяк і нікому не збіць» [4, с. 175 – 176]. Самым істот-ным у натуры Ф. Скарыны, мастак лічыць наступнае: «Ён імкнецца не толькі сам ісці да зор, але як Чалавек Новага, і брацію сваю «цягне да іх»» [4, с. 174]. У гэтай фразе разам з вобразным азначэннем ступені знач-насці зробленага першапраходцам («Подзвіг Францыска Скарыны») гучыць і вынашаная самім мастаком думка пра прызначэнне чалавека, яго адказную місію. Авалодаць такімі вяршынямі прагнуць усе героі У. Караткевіча. Да іх імкнуўся ён сам, заклікаючы за сабою чытачоў. Неабходная ўмова для ўзлёту чалавечага духу, яго высокіх парыванняў, на думку пісьменніка, заключаецца ў простых, здавалася б, рэчах. Для гэтага толькі трэба: «Зберагаць годнае і вялікае старое. Ствараць годнае і вялікае новае. Толькі годнае. Толькі вялікае» [4, с. 181].

Публіцыст адзначае, што культура ўяўляе сабою сукупнасць абсалютных каштоўнасцяў, адзінства вечных ідэалаў (ісціна, дабрыня, прыгажосць, святыня), якія ствараюцца ў свабоднай творчасці асобы. Зна-чыць, задача асобы – тварыць культуру, а задача культуры – берагчы асобу. На гэту дыялектыку асабістага і агульначалавечага ў духу ўказваў М. Бярдзяеў [6].

У. Караткевіч заўжды заставаўся прапагандыстам асветніцкіх прынцыпаў – нельга сядзець на месцы, трэба змагацца: «Кожны павінен працаваць на карысць грамадства, бо яму без яго – без мяне, без цябе (так, менавіта без цябе, друг!) – абысціся нельга. Нельга абысціся без тваёй працы, без тваёй адданасці і адказ-насці» [4, с. 151]. Асаблівая заслуга пісьменніка заключаецца ў тым, што ён трансліраваў у грамадскую свя-домасць беларусаў надзвычай важны кампанент – патрыятычную ідэю дзейсна-практычнай любові да Радзімы. Патрыятызм – складаная, шматаспектная культурная з’ява, якая ахоплівае ўсе сферы грамадства, асабліва яго свядомасць і духоўнае жыццё [7]. Патрыятызм разумеецца мастаком як адна з найбольш значных культурных каштоўнасцяў, якая з’яўляецца важнейшым духоўным набыткам асобы, характарызуе вышэй-шы ўзровень яе развіцця і праяўляецца ў актыўна-дзейнаснай самарэалізацыі на карысць айчыны. Патры-ятызм увасабляе любоў да радзімы, належнасць да яе гісторыі, культуры, дасягненняў, якія складаюць духоўна-маральную аснову асобы, фарміруюць яе грамадзянскую пазіцыю і патрэбу ў дастойным, сама-ахвярным служэнні бацькаўшчыне. У гістарычным плане патрыятызм пісьменніка выступае як крыніца духоўных сіл і здароўя грамадства, яго

жыццястойкасці, якая асабліва моцна праяўляецца на пераломных этапах развіцця, падчас гістарычна важных падзей, у часы цяжкіх выпрабаванняў.

Выхаванне патрыятызму – галоўная ідэя публіцыстычна-краязнаўчай дзейнасці У. Караткевіча. Яго патрыятызм можна дыферынцыраваць па шэрагу накірункаў: узвышана-эмацыянальны як узвышанае пачуццё любові да радзімы; актыўна-дзейнасны, які пабуджае да актыўных дзеянняў на карысць айчыны; асабісты патрыятызм, які разумеецца як сацыякультурная памяць і напружанне ўласных намаганняў. Пу-бліцыстыка У. Караткевіча прадугледжвае фарміраванне і развіццё цэлага комплексу станоўчых якасцяў асобы. Стрыжнем гэтага развіцця з'яўляюцца маральна-этычны і гісторыка-культурны кампаненты. Па-трыятызм у артыкулах мастака выступае ў адзінстве духоўнага асваення гісторыі і культуры свайго народу і актыўна-дзейнаснага ўдзелу ў вырашэнні праблем сучаснага грамадства. Такім чынам, патры-ятызм, паводле У. Караткевіча, праяўляецца ў адзінстве духоўнасці, грамадзянскасці і сацыяльнай актыў-насці асобы, якая ўсведамляе сваю непарыўнасць з радзімай.

Пасіўнасці, сузіральнасці пісьменнік супрацьпаставіў канцэпцыю дзейснага чалавека-грамадзяніна, які бачыць сэнс жыцця ў самаахвярным служэнні народу: «Іначай жыць, іначай пісаць я не хачу і не магу» [4, с. 124]. Творца раскрываў вочы чытачам на патрэбу «змястоўна пражываць жыццё». Дзеля гэтага неаб-ходна далучыцца да жыцця грамадскага, нацыянальнага, агульначалавечага. Такім чынам, У. Караткевіч трактуе культуру, як творчае ўзыходжанне ад канкрэтнага да ўсеагульнага, усечалавечага [8]. Менавіта ў кантэксце сацыякультурнай сістэмы ўсяго чалавецтва асоба можа спазнаць самую сябе, вызначыць мэту, адшукаць сваё прызначэнне: «Адкуль ты ведаеш, дружа, што ты не здатны да таго, каб ісці першым? Чаму загадзя згаджаешся, што месца тваё не наперадзе? Проста дагэтуль нават ты сам не ведаў сіл, сха-ваных у табе, не бачыў жадання прынесці ўсё сваёй грамадзе, свайму роду, свайму чалавецтву штосьці вя-лікае, непаўторнае» [4, с. 151 – 152].

Самапазнанне, даказваў У. Караткевіч, прыводзіць да разумення таго, што сапраўднае бяссмерце чалавека ў здзейсненых ім вялікіх справах. Сваю патрыятычную канцэпцыю пісьменнік сцвярджаў не толькі тэарэтычна, але і практычна, уласным жыццём і нястомнай дзейнасцю. «Ён цаніў не столькі слова, – успамінае А. Мальдзіс, – колькі справу, куды адносіў таксама творчасць, пісанне. Колькі разоў нам, яго сябрам, даводзілася чуць прыкладна такое: «Вось вы прыгожанька гаворыце, але гэтага мала. Са слоў кашы не зварыш – Вы лепш зрабіце (напішыце, абараніце)» [1, с. 198].

У пісьменніка было разуменне, што слова таксама абмежаванае. Не кожнаму чытачу дадзена ажы-віць у сваім уяўленні вобразы кнігі. Іншая справа – дзеянне. Дзеянне сцэнічнае, кінематаграфічнае. Яно абуджае думкі і эмоцыі не толькі словам, але і рухам, гукам, колерам. Яно ўздзейнічае адразу, адначасова на сотні, тысячы, а то і мільёны. Гэтым разуменнем тлумачыцца няспынная цяга У. Караткевіча да тэатра, кінематографа, тэлебачання. «Іх велізарныя магчымасці вабілі яго заўсёды, нават пасля няўдач. Яго часта не разумелі – не ставілі, не здымалі. Або разумелі і бачылі не так, як разумеў і бачыў ён. І тады ён умоль-ваў «не псаваць гісторыю» [1, с. 199 – 200]. Мастак ствараў арыгінальныя кінасцэнарыі (накшталт двух-серыйнага фільма пра славутую бітву на Нямізе, які атрымаў станоўчыя водгукі і які, на жаль, у тагачаснага кіраўніцтва «Беларусьфільма» і Дзяржкіно БССР выклікаў боязь. «Як жа, даўніна, гісторыя, – пісаў У. Караткевіч. – Можа быць перакос, калі патрабуецца рабіць фільмы на сучасныя тэмы» [9, с. 281]. Пачатак сваёй кінакар'еры пісьменнік датуе вераснем 1959 года, калі быў закончаны сцэнарый мастац-кага фільма «Дзеці ракі» (не быў пастаўлены). Потым будуць напоўненыя глыбокім філасофскім розду-мам кінасцэнарыі: «Сведкі вечнасці» (1964), «Памяць каменя» (1966), «Будзь шчаслівая, рака» (1967), «Адам і Марыля» (1968). Адны з іх выйшлі на экраны. Другія – «Жыціе і ўзнясенне Юрася Братчыка» – ляглі на паліцу. Фільм быў забаронены, што з'яўлялася заканамернасцю. Сваёй «несіметрычнасцю», вы-ключнасцю героя і абставін, адмаўленнем усяго афіцыйнага і кананічнага, метафарычнасцю, дзёрзкасцю, гарэзлівасцю ён выбіваўся з застойнай атмасферы, пярэчыў ёй. Пісьменнік даказваў сваім сябрам вартасць кінематографа ў нацыянальным абуджэнні: «Гэта ж магутная сіла! Раман у нашых беларускіх умовах прачытае ну дзесяць, ну дваццаць тысяч чалавек. А добры фільм паглядзяць мільёны. Разумееце, якая маж-лівасць уздзейнічаць на народ, абуджаць яго годнасць, яго памяць!» [1, с. 92]. Пісьменнік вядзе зацяжную барацьбу з амаральнасцю, бяспамяцтвам, бо ў чалавеку ад прыроды закладзена прага духоўнасці, патрэба дасягаць этычнай чысціні кожнага дня, кожнага кроку. У. Караткевіч бачыў у чала-веку, у яго маральным удасканаленні панацэю ад усіх нягод. Усё ў чалавеку, толькі ён творца свайго шляху: «І на кожным шляху (і не аднойчы) чакае чалавека высакародная работа. І кожны шлях вянчаецца зорным часам. Тваім. Толькі не прапусці. А каб не прапусціць, патрэбна гатоўнасць, маральная сіла, сумленне, звычайная людская чысціня. Проста трэба быць дужа харошым чалавекам» [4, с. 152].

Ахвяруючы адным чалавекам, мы ахвяруем народам – такіх пазіцый прытрымліваўся пісьменнік. Мастак пільна ўглядаўся ў чалавечыя ўзаемаадносіны, востра бачыў выдаткі сучаснага грамадства, якому пагражае духоўны апакаліпсіс. Адчужэнне грамадства ад культуры адбывалася на ўсіх узроўнях, а гэта вяло да цяжкай дэфармацыі сацыяльных сувязяў, стагнацыі і разбурэння самой культуры. Звяртаючыся да крытыкі культуры другой чвэрці ХХ стагоддзя, У. Караткевіч даследуе навуку, філасофію, мараль, мас-тацтва, асобу, імкнецца знайсці карані крызісу ў з'явах духоўнага парадку. Ён не абмяжоўваецца аналізам грамадскай свядомасці, а імкнецца выявіць тыя сацыяльна-палітычныя сілы, якія адказныя за крызіс куль-туры і спрабуюць спекуліраваць на ім. Мастак неаднаразова падкрэслівае, як важна думаць над кожным учынкам, умець адстойваць сваю пазіцыю. Іншымі словамі, за ўсё на гэтай Зямлі трэба несці адказнасць:
«І гэта трэба памятаць, як і тое, што тваёй цагліны не падыме больш ніхто. І, значыцца, ні табе, ні мне, нікому на зямлі нельга кінуць справу сваю, нельга пазбыцца адказнасці за яе» [4, с. 151].

Аб'ядноўваючы ў сябе незвычайную разнастайнасць даравання ды каласальную працаздольнасць, У. Караткевіч быў рознабаковы ў сваіх інтарэсах і дзейнасці, заўседы быў захоплены працай, ідэямі, здзяй-сненню якіх надаваў грамадскае значэнне, актыўна ўмешваўся ў сацыякультурную рэчаіснасць, выступа-ючы па балючых пытаннях сучаснасці. Ён пісаў лісты пратэсту ў Міністэрства культуры БССР супраць ак-таў вандалізму, наведваў ЦК КПБ, дзе выказваў свае меркаванні аб тым, якім яму бачыцца музей пад ад-крытым небам, якія помнікі архітэктуры рэстаўраваць у першую чаргу, аўтарытэтна ўзнімаў свой голас у абарону Верхняга горада ў Мінску, часта сустракаўся з моладдзю, чытаў свае вершы, даваў інтэрв'ю. Вось, напрыклад, урывак адной з размоў: «Якая задача літаратуры?» / «Быць сумленнем сваёй эпохі. Не хлусіць! Калі чалавек заблуджаўся шчыра, гісторыя прабачыць, калі хлусіў – не! Акрамя ж літаратуры, ніхто не скажа чалавеку, як жыць. Літаратура адлюстроўвае не столькі жыццё, колькі адносіны паміж людзьмі». «Што рабіць пісьменніку, калі такая складаная сітуацыя з мовай, як у нас цяпер у рэспубліцы?» / «Працаваць! Каб не сорамна было б у канцы, перад смерцю» [1, с. 145 – 146].

Нястомны шукальнік новага, У. Караткевіч аб'ездзіў шмат мясцін, лічыў лепшым адпачынкам паездкі ў далёкія куткі, пазнаючы людзей, свет. Крымскія горы і Далёкі Усход, Сярэдняя Азія і Прыбалтыка, Польшча і Чэхія – і гэта яшчэ не ўсе месцы, дзе ён пабываў. Кожная паездка пісьменніка – гэта новы цыкл нарысаў, эсэ пра край, людзей, праблемы, заўважаныя з вострай цікавасцю даследчыка. Нататкі з паездак па розных краінах, як гэта ні парадаксальна, цікавыя і беларусазнаўчым зместам («Здалёку я асабліва па-любіў Беларусь, яе людзей») [4, с. 9]. Распавядаючы пра розныя мясціны і народы, творца шукае там бела-рушчыну, робіць адпаведныя аналогіі, праводзіць паралелі, ацэньвае і такім чынам змушае і чытача думаць, шукаць. Напрыклад, Чэхія ў свядомасці мастака асацыіруецца з марай аб незалежнасці, з годным прыкла-дам. Яе старажытная архітэктура, захаваная на працягу стагоддзяў, вабіць і выклікае павагу. У чэшскіх замках і палацах, на вулачках шануюць мінулае, і гэта прымушае чытачоў асэнсаваць уласную гісторыю і культуру і стаўленне да іх.

Але галоўным падарожжам мастака праз усё жыццё было вандраванне па Беларусі, якую ён, па свайму прызнанню, «з'ездзіў, праплыў, прайшоў уласнымі нагамі ўсю» [4, с. 119]. Пісьменнікам кіравала прага як мага больш убачыць, глыбей зразумець, каб потым даступна і цікава расказаць, навучыць пазна-ваць сваю Беларусь. Публіцыст лічыў ганьбай няведанне зямлі, на якой жывеш. Яго страшэнна абуралі сцвярджэнні, што раней у беларусаў акрамя каўтуноў і лапцей нічога не было. Каб даказаць адваротнае, У. Караткевіч разглядаў як сваю кроўную справу выданне шматтомнага «Збору помнікаў гісторыі і куль-туры Беларусі», часопіса «Наш край», рашуча выступаў за адкрыццё Музею народнай архітэктуры і быту, пераконваў у неабходнасці шанавання памяці дзеячаў культуры, стварэння на месцах, дзе яны нарадзі-ліся, музеяў і помнікаў, каб жыла неўміручасць. Мастак меў на мэце здзівіць суайчыннікаў, паказаць, што на Беларусі ёсць замкі і храмы, палацы і старажытныя дамы. Фільм «Памяць», які выйшаў на эк-раны, выконваў такую задачу. У ім паказана, што ў Беларусі ёсць многа вартага дбайнай аховы. У часы, калі мі-нуўшчына перадавалася анафеме, калі ў Віцебску ўзарвалі Благавешчанне, у Магілёве – ратушу, а ў Гродне – фару Вітаўта, усё гэта ўспрымалася як смелае, ледзь не крамольнае. У. Караткевіч успамінаў: «Калі мы здымалі гэты фільм – сэрца балела. Многія цудоўныя палацы і замкі стаяць у запусценні, раз-бураюцца. Мала ў нас беражнага стаўлення да гістарычных помнікаў» [1, с. 42, 85].

Публіцыст нагадвае, што час нішчыць помнікі архітэктуры: «Працэс гэты няўхільны, але мы павінны зберагчы тое, што засталося. Так што трэба спяшацца» [4, с. 271]. Пісьменнік пераконвае нас, што ў курга-нах і гарадзішчах, мурах замкаў жыве Памяць. Якасць нашай Памяці, паводле У. Караткевіча, ніколі не аддзяляць сябе ад культуры. Помнікі не павінны быць разбураны, каб не абразіць

продкаў, даказвае мас-так. Ён заклікае шанаваць і берагчы памяткі дзён, каб не збяднеў край і не страціў памятлівасці народ: «То шукайце ж вы гэта сярэдневякоўе, збірайце яго, захоўвайце ў музеях, аднавіце тое, што засталося» [4, с. 87]. Сацыякультурнае бяспамяцтва, паводле У. Караткевіча, вядзе да ваяўнічага вандалізму і дазваляе сучас-нікам знішчаць замкі, цэрквы, або спаласоўваць нікчэмнымі надпісамі кару волата-дуба, моц якога ўраж-вала не адно пакаленне («Дрэва вечнасці»).

У. Караткевіч адводзіў значную ролю ў развіцці грамадства этнічнай культуры, традыцыям, якія ён ацэньваў як каштоўнейшы здабытак кожнай нацыі. Яны – як аснова, глеба, без іх не можа існаваць народ як асобнае этнічнае цэлае. Пісьменнік інтэнцыянальна выходзіць на ідэю арганічнай цэласнасці культуры, грамадства і дзяржавы, «духу народу», які выяўляецца ў спецыфіцы мовы, быту, фальклору дадзенага этнасу (Ф. Шэлінг) [8]. Без традыцый немагчыма сацыякультурная дынаміка чалавецтва, бо дэтэрмінанты многіх з'яў, якасцяў сучаснай культуры знаходзяцца ў глыбокай старажытнасці. Мастак намагаўся адшу-каць у культурнай спадчыне мінуўшчыны абсалютныя каштоўнасці, якія дапамаглі б беларусам захаваць нацыянальную самастойнасць, зберагчы сапраўдныя пачаткі сучаснай роднай культуры: «І песні, і нязлую размову бабуль на прызбе, і дзяўчат у вышываных сарочках, і ўсё, што завецца маім народам, самае каш-тоўнае, што ў мяне ёсць. І тое, што стварылі рукі ягоныя» [4, с. 106]. Ва ўсім гэтым бачыць і чуе пісь-меннік подых стагоддзяў, рух часу, таямніцы чалавечай душы, загадку нацыянальнага характару. Яго адчуванні перадаюцца як з публіцыстычным пафасам, так і з дапамогай метафарычных сродкаў, падтэксту, лірычнага гучання, часта па-навуковаму дакладна, выверана. Тым не менш уся стылёвая разнастайнасць падпарадкаваная адной вялікай ідэі, глыбокай і страснай аўтарскай думцы: «Мы ўсё ж зберажом, абаронім усё гэта. Упрыгожым яго, каб жыло вечна» [4, с. 106]. У мове і фальклоры, помніках гісторыі і матэ-рыяльнай культуры, творах літаратуры і мастацтва адлюстравана багатае духоўнае жыццё народу, высокія гуманістычныя ідэалы, творчы талент. «І гэта назапашанае мы павінны несці асцярожна, на выцягнутых далонях, як чашу з вадой» [4, с. 85]. Такім чынам, можна заўважыць выхад У. Караткевіча на ідэю В. Вундта аб тым, што «дух гісторыі», заключаны ў традыцыі, захоўвае вынікі творчасці індывідаў – культуру [10].

Пісьменнік быў вельмі ўстрывожаны тым, як з катастрафічнай хуткасцю страчваецца культурнае аб-лічча беларусаў, таму даказваў, што нацыянальная культура – гэта катэгарычны імператыў, неаспрэчная ўмова чалавечай экзістэнцыі. Усе нацыі не могуць жыць па-за культурай, па-за пэўным матэрыяльным і духоўным асяроддзем. Мастак заклікаў чытачоў вывучаць спадчыну, чэрпаць сілы з свядомасці сваёй далу-чанасці да гісторыі, да лёсу роднай культуры: «Тое, што мы творым сёння, таксама будзе старажытнасцю, і па справах нашых тыя людзі будуць меркаваць аб нас» [4, с. 45]. У. Караткевіч, па сутнасці, салідары-зуецца з М. Бахціным, які заўважыў, што многія асаблівасці культуры могуць быць правільна зразумелыя і ацэненыя не яе творцамі і непасрэднымі ўдзельнікамі, але нашчадкамі. Асэнсаванне лёсаў чужой культуры дапамагае лепей зразумець і сябе, сваю будучыню, бо без дыялогу культур няма гісторыі, няма развіцця [11].

Адной з важнейшых задач сваёй творчасці пісьменнік лічыў папулярызацыю дасягненняў сусветнай літаратуры сярод беларускіх чытачоў, бо праз вывучэнне моў і літаратур свету адбываецца працэс культур-най дыфузіі, асоба набывае магчымасць далучыцца да іншых культур, менталітэтаў, блізкіх да свайго ці су-працьлеглых. Такім чынам, У. Караткевіч прытрымліваецца традыцый вывучэння мовы ў непарыўнай сувя-зі з культурай канкрэтнага народу (В. Гумбальдт, Э. Касірэр) [12, 13]. Адзін з паказчыкаў сталасці нацы-янальнай культуры, на думку мастака, якраз і ёсць яе кампетэнтнасць аб стане іншых культур, што дазва-ляе пазнаць сябе ў аўтэнтычнасці, з аднаго боку, і як часцінку агульна-чалавечага, з другога. Гэта дэтэрміна-вала ўвагу У. Караткевіча як перакладчыка да творчасці Т. Шаўчэнкі, І. Франко, А. Міцкевіча, Ц. Норвіда, А. Талстога і інш. Мастак аддаваў перавагу духоўна блізкім аўтарам, творчасць якіх прасякнута моцным грамадзянскім і патрыятычным пафасам. Напрыклад, ён адзначае, што ў «асобе Лесі Украінкі ва ўкра-інскую літаратуру ўвайшло тое, чаго не хапала ў той час украінцам і нам: спалучаныя з высакароднай ідэяй інтэлігентнасць, вытанчанасць і, пры ўсёй нацыянальнай стыхіі, Сусветнасць у самым вышнім сэнсе гэтага слова» [4, с. 161]. Подзвіг Лесі Украінкі, як заўважае пісьменнік, «быў не толькі ў творчасці і абароне слова і песні. Ці не найвышэйшы подзвіг быў у абароне годнасці і краіны» [4, с. 159]. Набліжаючы творы іншых літаратур да свайго народу, У. Караткевіч клапаціўся аб стварэнні школы перакладчыкаў, аб больш поўным паданні асобных аўтараў і цэлых літаратур, заклікаў перакладаць класіку, а не нешта сярэдняе. Гэта было для творцы пачаткам вялікай справы – «планамерна пазнаваць іншыя краіны і народы» [4, с. 392], бо «калі хочаш ведаць суседа – ведай перш за ўсё яго паэзію» [4, с. 376]. Мастак мабілізаваў беларускіх літаратараў на пераклады сусветна вядомых твораў, еўрапейскай класікі, каб пака-

заць, што і па-беларуску можна выказваць самыя складаныя пачуцці і рэфлексіі, выказваць вытанчана, вы-сокім стылем і тым самым выклікаць павагу да сябе: «Нам патрэбны беларускі Дантэ, беларускі Гётэ. Без «Фаўста» і «Боскай камедыі» не можа абыходзіцца нічыя літаратура. І справа нават не ў Дантэ і Гётэ. Справа ў нас. Трэба гэта зрабіць для сябе, для ўзбагачэння сваёй мовы, для яе гнуткасці, шматфарбнасці, зіхацення, светаноснасці» [4, с. 373]. Мастак выказвае занепакоенасць сучасным станам беларускай мовы, шкадуе, што старажытныя беларускія словы забываюцца, а ім на змену прыходзяць недарэчныя адпаведнікі. У. Караткевіч абураецца, што вучоныя «не ўдасужыліся за сто год даследаванняў зрабіць адносна поўны слоўнік старабеларускай мовы» [4, с. 271]. Творца запрашае чытачоў авалодаць багаццем беларускай мовы, пераконвае ў тым, што мова, паэзія, музыка – гэта вышэйшыя сродкі сувязі між душамі людзей. Каб пад-крэсліць паўнавартасць і прыгажосць беларускай мовы, ён працуе ў класічных жанрах, тым самым з дапа-могай дасканалых кананічных формаў далучаючы беларускую літаратуру да скарбаў еўрапейскай. Праз гэтыя высілкі адбываецца і сцвярджэнне беларусаў як нацыі з высокай духоўнай культурай. Гаворачы аб тым, што, авалодваючы іншымі мовамі, асоба пашырае «дыяпазон чалавечага існавання», творца меў на ўвазе менавіта спасціжэнне пры дапамозе мовы карціны свету іншага народу. У артыкуле «Мова (што я думаю пра цябе)» мастак называе сябе нацыяналістам: «Што ж, я нацыяналіст. Украінскі (як мала хто з украінцаў ведаю Т. Шаўчэнку), польскі (Норвід і Міцкевіч – браты мае), рускі (за ўсіх, ад Кантэміра да Паўстоўскага і Шукшына). Усіхні нацыяналіст і ганаруся гэтым ярлыком» [14, с. 543]. Увогуле, пісьменнік сцвярджаў, што, чым больш чалавек культурна кампетэнтны, тым больш ён багацейшы. Але, найперш, трэба ведаць, любіць і бараніць сваё роднае: гісторыю, культуру, мову. Мастак шмат рэфлексіруе пра шляхі беларускай літаратуры, выказваецца супраць «застойнай» літаратуры, параўноўваючы яе з роўняддзю. Патрэбны ж, на думку творцы, «вяршыні» і «даліны». А. Мальдзіс узгадвае, што «яго злавала «мала-местачковасць», несучаснасць, адарванасць ад еўрапейскага вопыту іншых беларускіх сучаснікаў (ён іх знішчаў адной фразай «Ганна завіхалася ля печы»)» [15, с. 37]. На гэты конт У. Караткевіч выказваецца так: «Мы даўно выраслі з сялянскіх пялёнак. Мы адчулі ўжо добра сваю сталасць і менавіта таму мы ўжо зараз павінны выбраць, па якой дарозе пойдзе наша паэзія» [4, с. 343].

Адно з асноўных месц у культурным выхаванні публіцыст адводзіў мове. Духоўная культура нацыі, як вядома, уяўляе сабой іерархічную сістэму з шматлікіх структурных узроўняў, у аснове якой ляжыць нацыянальная мова, гэты, па выразу М. Хайдэгера, дом нашага духоўнага быцця [16]. Г.-Г. Гадамер, як і М. Хайдэгер, вызначае мову як універсальнае асяроддзе, у якім існуе і чалавек, і яго культура, у якім здзяйсняецца гістарычнае паданне [2]. Усе формы духоўнай культуры народу, калі гэта культура сапраўды створана ім, а не запазычана ці навязана са зне, рэалізуюцца, пачынаючы з мастацкай літаратуры і заканчваючы рэлігіяй, толькі праз нацыянальную мову. М. Крукоўскі слушна заўважае, што, як паасобны індывід становіцца асобай і можа далей развіваць сваю індывідуальную свядомасць, толькі навучыўшыся гаварыць, так і грамадства, народ рэалізуе сваю калектыўную нацыянальную самасвядомасць таксама праз нацыянальную мову [17, с. 158]. Мова выступае фактарам кансалідацыі грамадства, злучае пакаленні, выконвае трансляцыйную функцыю культуры, адлюстроўвае сацыякультурны вопыт. Для У. Караткевіча моўнае пытанне набывае сацыякультурнае значэнне, нацыянальна-патрыятычны і ідэалагічны характар.

Пісьменнік лічыў захаванне беларускай мовы ўмовай захавання цэлай нацыі. Адсюль і звышзадача – удасканальваць нацыянальную мову, даказваць яе развітасць, змагацца супраць моўнага ўціску, які мастак лічыў агрэсіяй на сакральныя этнічныя каштоўнасці, культурнай катастрофай. Словы М.С. Хрушчова, што неўзабаве, гадоў гэтак праз дваццаць, усе мовы ў нас зліюцца ў адну, здаваліся яму абсурдам («хіба можа быць луг толькі з рамонкаў?») [14, с. 98]. У. Караткевіч развіваў традыцыі беларускага асветніцтва, рытарычна патаючыся ў суайчыннікаў: «Ці маем мы права выракацца роднай мовы?». Аўтар тут жа пад-рабязна тлумачыць ступень яе рэферэнтнасці, сцвярджаючы, што мова – гэта духоўная спадчына, якая можа дапамагчы адрадзіцца. Гэта таксама сродак культурнай камунікацыі, важны фактар культурнай ды-фузіі, атрыбут аўтэнтычнасці: «Усе пачынаюць больш і больш разумець гэта. Сама гісторыя ўладна і неаб-ходна штурхае на прызнанне, на павагу, на захапленне багаццем і прыгажосцю беларускай мовы» [4, с. 288]. Публіцыст вызначае асноўныя шляхі адраджэння беларускай мовы. Ён пераконвае ў прынцыповай неабход-насці нацыі, якая далучае сябе да цывілізаванага свету, мець нацыянальную адукацыю і даваць моладзі магчымасць вучыцца на сваёй мове, успрымаць шырокі свет праз прызму свайго нацыянальнага мента-літэту, бо характар кожнай культуры вызначаецца ўнутраным аспектам – яе ментальнасцю. Пісьменнік нагадвае аб важнасці культурна-асветніцкай справы

ў гэтым кірунку: «Мы (размова тут ідзе аб асветні-ках, пісьменніках – *П.Б.*) ніколі не павінны забываць, наколькі годная наша праца і хто стаяў ля яе вы-токаў. А стаялі ля гэтых вытокаў, самі настаўнічалі, самі складалі першыя буквары і чытанкі Цётка, Купала і Колас» [4, с. 289].

У. Караткевіч ажыццяўляе рэтраспектыўны экскурс у гісторыю, растлумачваючы, што за крытэрый культурнай ідэнтыфікацыі заўсёды бралася мова. Па-за ўвагаю заставаліся складаныя сацыякультурныя працэсы, у якіх такім субстанцыям, як любоў да радзімы, патрыятызм, самаахвярнасць цяжка было акрэсліцца дакладна, выразна. Таму многія беларускія падзвіжнікі памылкова ідэнтыфікаваліся навукоўцамі ў кантэксце рускай ці польскай культур. Пункт гледжання пісьменніка на культурную і моўную прыналежнасць філосафаў, літаратараў, палітыкаў і грамадскіх дзеячаў, што паходзілі з Беларусі, але з шэрага прычынаў атрымалі прызнанне і павагу часткова (цалкам) па-за яе межамі, супадае з пазіцыяй В. Ластоўскага: «Паколькі не заўсёды была магчымасць у сыноў нашай радзімы пісаць на беларускай мове да гісторыі творчасці мыслі беларускай павінны быць палічаны ўсе творы сыноў зямлі народа нашага, нягледзячы на тое, якой мовай і дзе яны створаны» [18, с. 321]. Аднак, як сцвярджае У. Караткевіч, жыц-цёвы і творчы лёс большасці нашых дзеячаў культуры, пачынальнікаў новай літаратуры дэтэрмінавала менавіта нацыянальная самасвядомасць беларуса. І тут вельмі важна кожнаму, заўважае мастак, вызна-чыць свае духоўныя і нацыянальныя арыенціры: ««Творчую радзіму» чалавек не выбірае. Яна выбірае яго, калі ён разумны і ўмее прыслухацца да сябе» [14, с. 548]. Пісьменнік пераконвае чытачоў, што творы Я. Баршчэўскага па-польску, М. Багдановіча і Т. Шаўчэнкі па-руску, А. Пушкіна па-французску не ідуць па якасці ні ў якое параўнанне з творамі на роднай мове. Мастак падкрэсліваў, што культура высокага ўзроўню, якую называлі рускай ці польскай, была і застаецца беларускай, бо ўзнікла на беларускай зямлі і спалучае ў сабе мясцовыя традыцыі, звычаі, беларускі дух.

Паводле В. Гумбальдта, кожная мова мае сваю «ўнутраную форму», абумоўленую «самабытнасцю народнага духу» [19]. У. Караткевіч, таксама як і В. Гумбальдт, падкрэслівае, што кожная мова заключае ў сабе сваю нацыянальную самабытную класіфікацыйную сістэму, якая вызначае светапогляд носьбітаў дадзенай мовы і фарміруе іх карціну свету. Публіцыст ставіць творцаў перад выбарам: «быць пасрэднасцю на мове суседа або нечым значным на сваёй. А «значны» гэта азначае «значны для многіх», калі б нават на тваёй мове гаварылі сто чалавек» [14, с. 548].

Пісьменнік садзейнічаў фарміраванню экалагічнай культуры і выхаванню экалагічнай свядомас-ці праз сваю актыўную грамадзянскую пазіцыю, якую ён займаў у вырашэнні глабальнай праблемы «Чалавек і прырода». А. Мальдзіс адзначае, што «У. Караткевіч быў першы, хто ў Беларусі стаў біць трывогу, прадбачучы экалагічныя крызісы» [1, с. 99]. Яго хвалявалі непрадуманыя рашэнні, што абяднялі прыродныя і культурныя багацці рэспублікі, ускладнялі яе экалагічныя абставіны. У гады ўсеагульнага замілавання меліярацыяй і хімізацыяй пісьменнік адчувае ўсю пагрозу, якую яны нясуць сельскай гаспадарцы, людзям пры няўмелым іх выкарыстанні. Ён робіць у сваіх дзённіках наступныя запісы: «У свеце навук». «Палессе ўчора, сёння, заўтра». Я мяркую, што пры гэтай навуцы – ніякага «заўтра» ў Палесся быць не можа. Хіба што загаджанне, занесенае падчас чорных бураў тарфяным пылам і пяском. А я яшчэ з сярэдзіны шасцідзесятых, таму ўжо дваццаць год, званіў ва ўсе званы аб шкодзе меліярацыіі і смяротнай шкодзе гербіцыдаў» [9, с. 289].

Для У. Караткевіча прырода – адзінае цэлае, дзе ўсе часткі звязаны ў пэўную гармонію, якая мае пэўны сэнс. Чалавек знітаваны з багаццем прыроды. Ён сам – часцінка гэтага свету, пасланы ў жыццё, каб раскрыць яго таямніцы: «Ты – чалавек, створаны прыродай і роўны з ёю. Тваё ведамства – увесь свет вакол цябе. Усё ўва мне, і я ва ўсім» [4, с. 283]. Унутраная чуйнасць да прыгажосці нараджае ў эсэ і нарысах творцы глыбокія эмацыянальна-экалагічныя і філасофскія рэфлексіі. У век бяздумнага знішчэння хараства, супярэчнасці паміж цывілізацыяй і натуральным светам непасрэдна адбіваюцца на маральным вобліку сучасніка, ставяць перад кожнай асобай шмат псіхалагічных пытанняў. Пісьменнік спрабуе адлюстраваць дысанансы ў навакольным ассяроддзі, выявіць змены ў душы чалавека, які страціў меру разумнасці ў адносінах з жывой прыродай: «Чалавек запраграміраваны для свежай вады, абмытай дажджом зеляніны, чыстага паветра. І таму калі мы хоць у дробязі нявечым адзіную, раз і назаўсёды нам дадзеную біясферу – мы нявечым саміх сябе» [4, с. 276].

Страшэнная трагедыя свету, – тлумачыць У. Караткевіч, – калі чалавек знішчае прыгажосць у сабе і ў прыродзе, учыняе драпежны гвалт і застаецца пры гэтым спакойным і абыякавым: «Заплаціў за паляўнічы білет – ну і ўсё. А дзе такія жывёлы, як тур, балотная рысь, чорны заяц? На гербе горада Копыся? Хіба што толькі на гербе» [4, с. 278]. Тым самым, паводле пісьменніка, чалавек забівае ў сябе паэзію жыцця, нішчыць спрадвечныя каштоўнасці, якімі яго надзяліла маціпрырода. Страціўшы адчуванне хара-ства натуральнага свету, чалавек пераўтвараецца ў бяздушную «цывілізаваную» істоту.

Такім чынам, творы У. Караткевіча пра чалавека і прыроду павышаюць экалагічную культуру, што асабліва важна ва ўмовах крызісных сітуацый для акаляючага асяроддзя, садзейнічаюць псіхалагічнай пераарыентацыі людзей, мабілізуюць іх на абарону прыроды. Аксіялагічным ядром экалагічнай свядо-масці, якую імкнуўся выхоўваць мастак, з'яўляюцца наступныя каштоўнасныя арыентацыі: 1) прызнанне ўсяго прыроднага апрыоры самакаштоўным, маючым права на існаванне; 2) дыялог, гармонія, узаема-разуменне ў адносінах да прыроды; 3) сцвярджэнне непарыўнага адзінства чалавека і прыроднага свету; 4) вызначэнне аховы прыроды ў якасці неад'емнага кампанента аховы самога чалавека; 5) вылучэнне на першы план асабістай адказнасці, самакантролю, самарэгуляцыі паводзін.

Пісьменнік папярэджвае, што навука і тэхніка, якія робяць чалавека магутным, бязмерна павышаюць яго адказнасць за ўсё, што ён робіць. Мастак гаворыць: «А я ж толькі хацеў папярэдзіць: атам – магутная, карысная, але і небяспечная сіла. Дураксы, а дураксаў на свеце многа, могуць знішчыць зямлю» [1, с. 17]. Навідавоку грамадзянская трывога У. Караткевіча. Абурана гучыць яго голас у адрас тых, «хто труціць азёры, рэкі, лясы, хто не сёння-заўтра атруціць акіяны». У пазіцыі мастака няма перабольшання, залішняй драматызацыі сітуацыі. Зыходзячы з рэалій часу, калі ідзе татальнае знішчэнне прыроды, пасля горкага ўроку Чарнобыля, словы публіцыста набываюць асаблівую актуальнасць.

Нарысы, эсэ, артыкулы У. Караткевіча напісаны ярка, страсна, з любоўю да Беларусі, яе людзей, якія пакінулі значны след у гісторыі бацькаўшчыны і ў асабістым жыцці творцы. Раскрываючы ў нарысах, артыкулах мастацкія багацці мінулага, ён спрабаваў глыбей пазнаць народ і ўключыць лепшае з культурнай спадчыны ў наш духоўны актыў: «Уваходзіў у галоўную справу майго жыцця: асэнсаванне нас, сённяшніх, асэнсаванне таго, хто мы ёсць сёння і куды мы ідзем, – праз асэнсаванне нашага ўчора» [4, с. 115 – 116]. Мастак эфектыўна выхоўваў сучаснікаў на ідэйна-патрыятычных ідэалах, узбагачаў і ўдасканальваў культуру. Чалавек, на яго думку, тады становіцца Асобай, калі імкнецца да вяршыняў сусветнай культуры, прагне засваення агульначалавечых духоўных скарбаў. Пісьменнік намагаецца зрабіць так, каб чытач спасцігнуў гэтую ісціну. У. Караткевіч раскрывае сутнасць эстэтычных поглядаў розных эпох, расказвае пра унікальнае майстэрства творцаў, дае магчымасць глыбей усвядоміць каштоўнасць зробленага папярэднікамі, выхоўвае культуратворчы патэнцыял, мысленне, высокі эстэтычны густ.

Творы мастака вучаць любіць і берагчы чалавечае ў чалавеку, паглыбляюць веды пра зямлю, на якой жывем, абуджаюць, трывожаць фантазію і розум: «Пранікнецеся любоўю да маёй роднай Беларусі, людзі, – просіць пісьменнік, – велічная і гордая, яна таго вартая» [4, с. 172]. Ужо ў ранніх публікацыях творца зразумеў адказную місію вешчуна і змагара адначасова, усвядоміў сваё прызначэнне: «Трэба працаваць. Не для сябе, а для маёй роднай краіны, для Беларусі, якой, калі дазволіць лёс, я паслужу, колькі будзе дадзена дзён, – многа або мала, але да канца» [4, с. 43].

**Высновы.** Дамінантай эпістэмалагічных уяўленняў У. Караткевіча з'яўляецца комплекс каштоўнасных арыентацый і рэгулятараў. У якасці базавых аўтар вылучае нацыянальную самасвядомасць як фактар культуратворчасці, узвышэнне мовы, выхаванне моладзі праз веды, фальклор і мастацтва, вызначэнне ролі асобы ў гісторыі і культуры, фарміраванне экалагічнай культуры, павагі да сацыякультурнай памяці, заклік да актыўна-дзейнаснага патрыятызму, асэнсаванне нацыянальнай культуры ў славянскім і еўрапейскім культурным кантэксце, вывучэнне народу як суб'екту культуры, даследаванне беларускага нацыянальнага характару.

Дзейнасць У. Караткевіча вырашала задачы як тэарэтычна-канцэптуальнага, так і канкрэтна-практычнага характару. У большасці твораў пісьменніка ўздымаецца праблема сутнасці культуратворчай працы на карысць нацыянальнай культуры. Мастак адзначаў, што на сучасным этапе развіцця Беларусі, якая адчувае на сабе глабальныя працэсы індустрыялізацыі і урбанізацыі, рэзка ўзрастае роля дзяржаўных структур у адбудове, захаванні і развіцці беларускай культуры. Пісьменнік акрэслівае задачы дзяржавы, пасутнасці фармулюючы асновы культурнай палітыкі, яе ідэйную скіраванасць у розных сферах мастацтва, адукацыі, экалагічнага выхавання, культурнага адраджэння.

Пазіцыя У. Караткевіча – чалавечая, мастацкая, грамадзянская будзе запатрабаваная і ў будучым. Можна сказаць, што ў яго творчасці закладзена ўся культуралагічная частка нацыянальнай, дзяржаўнай ідэалогіі. Яе сутнасць – Беларусь паўнацэнная па культурнай спадчыне, полінацыянальная, шматмоўная, поліканфесійная краіна. Культуралагічныя ідэі творчасці пісьменніка і яго практычная дзейнасць дазваляюць сфармуляваць асноўныя палажэнні дзяржаўнай культурнай палітыкі.

Прыярытэтнымі кірункамі праграмы У. Караткевіча па вырашэнню канкрэтных праблем культурнага будаўніцтва можна лічыць: ахову нацыянальнай культуры і мовы ў свеце пашырэння міжнародных сувязяў і камунікацый; стварэнне магчымасцяў да далучэння розных слаёў насельніцтва, асабліва

моладзі, да творчага актыўнага жыцця ў залежнасці ад здольнасцяў і схільнасцяў; падтрымку творчасці і стварэнне ўмоў для творчай свабоды; садзейнічанне наватарству і абнаўленню культуры; забеспячэнне захавання матэрыяльнай і духоўнай культуры мінулага; спрыянне ўзаемаадносінам і ўзаемаразуменню паміж рознымі культурнымі групамі ўнутры краіны і міждзяржаўнаму ўзаемадзеянню.

ЛІТАРАТУРА

1. Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 229 с.
2. Гадамер, Г.-Г. Истина и метод: Основы философской герменевтики / Г.-Г. Гадамер. – М.: Прогресс, 1988. – 699 с.
3. Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества / М.М. Бахтин. – М.: Искусство, 1979. – 424 с.
4. Караткевіч, У. Збор твораў: у 8-мі т. / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1991. – Т. 8: у 2-х кн. Кн. 2: З жыццяпісу, нарысы, эсэ, публіцыстыка, постаці, крытычныя творы, інтэрв'ю, летапіс жыцця і творчасці. – 495 с.
5. Швейцер, А. Культура и этика / А. Швейцер. – М.: Прогресс, 1973. – 343 с.
6. Бердяев, Н.А. Творчество и объективация / Н.А. Бердяев. – Минск: Экономпресс, 2000. – 304 с.
7. Узгорок, М.Ю. Патриотизм как культурная ценность / М.Ю. Узгорок // Прырода, чалавек, культура: праблемы гармоніі: матэрыялы навук. канф., Мінск, 25 – 26 сак. 2003 г. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2003. – С. 432 – 439.
8. Шеллинг, Ф. Философия искусства / Ф. Шеллинг. – СПб.: Алетейя, 1996. – 496 с.
9. Русецкі, А. Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць: Нататкі літаратурнай творчасці / А. Русецкі. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 300 с.
10. Вундт, В. Проблемы психологии народов // Преступная толпа / В. Вундт. – М.: Ин-т психологии РАН, КСП+, 1997. – 308 с.
11. Бахтин, М.М. Вопросы литературы и эстетики: Исследования разных лет / М.М. Бахтин. – М.: Худож. лит., 1975. – 502 с.
12. Гумбольдт, В. Избранные труды по языкознанию / В. Гумбольдт. – М.: Прогресс, 1984. – 397 с.
13. Кассирер, Э. Опыт о человеке // Избранное / Э. Кассирер. – М.: Гардарика, 1998. – 784 с.
14. Караткевіч, У. Творы: Проза, драматургія, публіцыстыка / У. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ., 1996. – 557 с.
15. Мальдзіс, А. Уладзімір Караткевіч – пісьменнік беларускі і еўрапейскі / А. Мальдзіс // Беларусіка= =Albaruthenica: зб. навук. прац / рэдкал.: А. Мальдзіс (адказны рэд.) [і інш.]. – Мінск: Нац. нав.-асвет. цэнтр імя Ф. Скарыны. – Мінск, 2000. – Кн. 16. – С. 35 – 39.
16. Хайдеггер, М. Язык / М. Хайдеггер. – СПб.: Эйдос, 1991. – 19 с.
17. Крукоўскі, М.І. Філасофія культуры: Уводзіны ў тэарэтычную культуралогію / М.І. Крукоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 187 с.
18. Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі; уклад, прадмова і каментарыі Я. Янушкевіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1997. – 510 с.
19. Гумбольдт, В. Язык и философия культуры / В. Гумбольдт. – М.: Прогресс, 1985. – 451 с.

*Паступіў 24.11.2008*